ISSN 2351-6658
ISSN (ONLINE) 2351-6666

VYTAUTAS MAGNUS UNIVERSITY

# Пяты Міжнародны Кангрэс даследчыкаў Беларусі

Працоўныя матэрыялы

Том 5 (2016)

# The Fifth International Congress of Belarusian Studies

Working Papers

Volume 5 (2016)

VYTAUTAS MAGNUS UNIVERSITY PRESS
KAUNAS, LITHUANIA, 2016

Пяты Міжнародны Кангрэс даследчыкаў Беларусі
Працоўныя матэрыялы
Том 5 (2016)

*Пяты Міжнародны Кангрэс даследчыкаў Беларусі адбыўся 2–4 кастрычніка 2015 года ў Коўне (Літва)*


**Навуковая Рада**
**Андрэй Казакевіч** (старшыня) – доктар палітычных навук (PhD in Political Science),
Інстытут палітычных даследаванняў “Палітычная сфера”.
**Кірыл Гарошка** (асістэнт) – магістр палітычных навук, Інстытут палітычных даследаванняў “Палітычная сфера”.
**Вольга Беланоўская** – кандыдат псіхалагічных навук, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт.
**Томаш Блашчак** – доктар гісторыі (PhD in History), Універсітэт Вітаўта Вялікага.
**Аксана Бязлепкіна** – доктар філалагічных навук (PhD in Philology), Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.
**Наталля Васілевіч** – магістр палітычных навук, цэнтр “Экумена”.
**Кірыл Гайдук** – доктар эканамічных навук (PhD in International Economics),
прадстаўніцтва Сусветнага банка ў Рэспубліцы Беларусь.
**Алег Дзярновіч** – кандыдат гістарычных навук, Інстытут гісторыі НАН Беларусі.
**Аляксей Ластоўскі** – кандыдат сацыялагічных навук, Інстытут палітычных даследаванняў “Палітычная сфера”.
**Андрэй Лаўрухін** – кандыдат філасофскіх навук, Нацыянальны даследчы ўніверсітэт “Вышэйшая школа эканомікі”.
**Пётр Рудкоўскі** – магістр філасофіі, Універсітэт Лазарскага.
**Сцяпан Стурэйка** – кандыдат этналагічных навук, Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт.
**Андрэй Ціхаміраў** – дактарант Інстытута гісторыі навукі Польскай акадэміі навук.



**Стыль-рэдактура і карэктура**
Таццяна Кур’ян (беларуская і руская мова)
Максім Александровіч (англійская мова)
Томаш Блашчак (польская мова)

**Вёрстка і макет вокладкі**
Дзмітры Ісаеў

**Заснавальнікі і партнёры**
Інстытут “Палітычная сфера”, Беларусь
Універсітэт Вітаўта Вялікага, Літва
Інстытут Вялікага Княства Літоўскага, Літва

Беларускі інстытут стратэгічных даследаванняў, Беларусь
Міжнародны кансорцыум “ЕўраБеларусь”, Беларусь
Інтэрнэт-часопіс “Новая Еўропа”, Беларусь
Міністэрства замежных спраў Літвы
Літоўская праграма супрацоўніцтва і развіцця
Нямецкі фонд Маршала, ЗША
Фонд імя Конрада Адэнаўэра, Германія
Літоўская навуковая рада, Літва
USAID, ЗША
Пакт, ЗША
Цэнтр геапалітычных даследаванняў, Літва
Беларускі Калегіюм, Беларусь
Фонд Генрыха Бёля, Германія



© *Political Sphere* Institute of Political Studies (тэкст і афармленне)
© Vytautas Magnus University
© Ministry of Foreign Affairs of the Republic of Lithuania, 2016



ISSN 2351-6658
ISSN (ONLINE) 2351-6666

The Fifth International Congress of Belarusian Studies
Working Papers
Volume 5 (2016)

*The Fifth International Congress of Belarusian Studies was held on 2–4 October 2015 in Kaunas (Lithuania).*

**Academic Council (Rada)**
**Andrej Kazakievič** (chairman) – PhD in Political Science, *Political Sphere* Institute of Political Studies (Belarus-Lithuania).
**Kiryl Haroshka** (assistant) – MA in Political Science, *Political Sphere* Institute of Political Studies (Belarus-Lithuania).
**Aksana Biazliepkina** – PhD in Philology, Belarusian State University.
**Voĺha Bielanoŭskaja** – PhD in Psychology, Belarusian State Pedagogical University.
**Tomaš Blaščak** – PhD in History, Vytautas Magnus University.
**Andrej Cichamiraŭ** – PhD student, Institute for the History of Science, Polish Academy of Sciences.
**Alieh Dziarnovič** – PhD in History, Institute of History, Belarusian Academy of Sciences.
**Kiryl Hajduk** – PhD in International Economics, World Bank Office in Belarus.
**Andrej Laŭruchin** – PhD in Philosophy, National Research University Higher School of Economics.
**Aliaksiej Lastoŭski** – PhD in Sociology, *Political Sphere* Institute of Political Studies.
**Piotr Rudkoŭski** – MA in Philosophy, Lazarski University.
**Sciapan Sturejka** – PhD in Ethnology, European Humanities University.
**Natallia Vasilievič** – MA in Political Sciences, Centre Ecumena.

**Proof-reading**
Tacciana Kurjan (Belarusian and Russian)
Maksim Alieksandrovič (English)
Tomaš Blaščak (Polish)

**Design and Layout**
Dzmitry Isajeŭ

**Founders and Organisers**
Institute of Political Studies *Palityčnaja Sfiera (Political Sphere),* Belarus
Vytautas Magnus University, Lithuania
Institute of the Grand Duchy of Lithuania, Lithuania

International Consortium *EuroBelarus,* Belarus
Belarusian Institute for Strategic Studies, Belarus
Internet magazine *Novaja Eŭropa / New Europe,* Belarus
Ministry of Foreign Affairs of Lithuania
Lithuanian Development Cooperation Programme
German Marshall Fund, USA
Konrad Adenauer Foundation, Germany
Research Council of Lithuania, Lithuania
USAID, USA
Pact, USA
Centre for Geopolitical Studies, Lithuania
Belarusian Collegium, Belarus
Heinrich Böll Foundation, Germany

© *Political Sphere* Institute of Political Studies (тэкст і афармленне)
© Vytautas Magnus University
© Ministry of Foreign Affairs of the Republic of Lithuania, 2016

ISSN 2351-6658
ISSN (ONLINE) 2351-6666

Міжнародны Кангрэс даследчыкаў Беларусі
International Congress of Belarusian Studies
Tarptautinis Baltarusijos tyrimų kongresas

Міжнародны Кангрэс даследчыкаў Беларусі быў заснаваны 6 кастрычніка 2010 года ў г. Коўна (Літва) на сустрэчы прадстаўнікоў беларускай і літоўскай акадэмічнай і экспертнай супольнасці.

Кангрэс ініцыяваны як штогадовая сустрэча беларускіх і замежных навукоўцаў, экспертаў, аналітыкаў, прадстаўнікоў грамадскіх і дзяржаўных інстытуцый, якія займаюцца даследаваннем Беларусі.

**Місія Кангрэсу** – развіццё супольнасці навукоўцаў, аналітыкаў і экспертаў, а таксама спрыянне больш глыбокаму разуменню Беларусі ў акадэмічным і грамадскім асяродку краіны, рэгіёна і свету.

Кангрэс бачыцца месцам прэзентацыі вынікаў працы навукоўцаў і экспертаў на працягу года. Акрамя гэтага, правядзенне Кангрэсу з'яўляецца выдатнай магчымасцю для распрацоўкі новых жыццяздольных даследчых і грамадскіх праектаў, абмену меркаваннямі і ідэямі, наладжвання нефармальных кантактаў. Кангрэс дазволіць сістэматызаваць веды пра Беларусь, а таксама заахвоціць практыку ўзаемнага супрацоўніцтва і камунікацыі.

Кангрэс разлічаны на ўдзел шырокага кола спецыялістаў з Беларусі, Еўрапейскага Саюза, Расіі, ЗША, Украіны і іншых краін свету.

Праца Кангрэсу спалучае традыцыйныя пасяджэнні з арганізацыяй экспертных панэляў і грамадскіх дыскусій па актуальных тэмах беларускай палітыкі, культуры, грамадства, рэгіянальнага і міжнароднага супрацоўніцтва.

The International Congress of Belarusian Studies was founded at the meeting of Belarusian and Lithuanian scholars and experts on 6 October, 2010 in Kaunas, Lithuania.

The Congress was initiated as an annual meeting of Belarusian and foreign scholars, experts, analysts and representatives of civil society and government institutions who are involved in studying Belarus.

**The Congress' mission** is to promote a deeper understanding of Belarus in academic and civil communities of the country, region and the world.

The Congress aims to become a place for presentation of the outcomes of scholarly and expert activities produced throughout the year. In addition, the Congress is an excellent opportunity to develop new research and community projects, exchange views and ideas and establish informal contacts.

The Congress combines traditional academic activities with expert panels and public discussions on topical issues of Belarusian politics, culture, society, regional and international cooperation.

2010 m. spalio 6 d. Kaune (Lietuva) susirinkę baltarusių ir lietuvių mokslininkai ir ekspertai nutarė surengti tarptautinį Baltarusijos tyrimų kongresą.

Tokie kongresai turėjo tapti kasmetiniais baltarusių ir kitų šalių mokslininkų, ekspertų, analitikų, visuomeninių organizacijų ir valstybinių institucijų atstovų, besidominčių Baltarusija bei atliekančių jos tyrimus, suvažiavimais.

**Kongreso misija** – išvystyti mokslininkų, analitikų ir ekspertų visuomenę, siekti geresnio Baltarusijos supratimo tarp akademinių ir visuomeninių centrų šalyje, regione ir pasaulyje.

Kongresas turėtų tapti mokslininkų ir ekspertų per metus atliktų darbų rezultatų pristatymo vieta. Taipogi kongresas gali būti puikia vieta, kur gimtų nauji tyrimų ar visuomeniniai projektai, būtų keičiamasi idėjomis ar užmezgami nauji neformalūs kontaktai.

Kongreso darbą nutarta organizuoti sukuriant įvairias ekspertų ir diskusijų darbo grupes, kuriose būtų gvildenamos aktualios baltarusiškos politikos, kultūros, visuomenės tyrimų, regioninio ir tarptautinio bendradarbiavimo temos.

Web: http://icbs.lt/
e-mail: icbs@palityka.org
Tel. (BEL) + 375 29 673 32 96
Tel. (LT) + 370 68 63 11 46
Fax. + 370 37 20 38 58

Пяты Міжнародны Кангрэс даследчыкаў Беларусі
Працоўныя матэрыялы
Том 5 (2016)

The Fifth International Congress of Belarusian Studies
Working Papers
Volume 5 (2016)

**Founders and Organisers**
Institute of Political Studies *Palityčnaja Sfiera (Political Sphere)*, Belarus
Vytautas Magnus University, Lithuania
Institute of the Grand Duchy of Lithuania, Lithuania

International Consortium *EuroBelarus,* Belarus
Belarusian Institute for Strategic Studies, Belarus
Internet magazine *Novaja Eŭropa / New Europe,* Belarus
Ministry of Foreign Affairs of Lithuania
Lithuanian Development Cooperation Programme
German Marshall Fund, USA
Konrad Adenauer Foundation, Germany
Research Council of Lithuania, Lithuania
USAID, USA
Pact, USA
Centre for Geopolitical Studies, Lithuania
Belarusian Collegium, Belarus
Heinrich Böll Foundation, Germany

*Працоўныя матэрыялы Пятага Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі, што адбыўся 2–4 кастрычніка 2015 года ў Коўне, Літва. Тэксты прысвечаны актуальным даследаванням у галіне беларускай гісторыі, палітыкі, грамадства і культуры.*

*Working papers of the Fifth International Congress of Belarusian Studies, which was held on 2–4 October 2015 in Kaunas, Lithuania. The texts present current research on Belarusian history, politics, society and culture.*

Выдавец - Інстытут палітычных даследаванняў «Палітычная сфера»
Publisher - Institute of Political Studies *'Political Sphere'*

Web: http://icbs.lt/
e-mail: icbs@palityka.org
Tel. (BEL) + 375 29 673 32 96
Tel. (LT) + 370 68 63 11 46
Fax. + 370 37 20 38 58

# ПРАБЛЕМЫ ІДЭНТЫФІКАЦЫІ БЕЛАРУСКАГА І ЎКРАІНСКАГА САЦЫЯКУЛЬТУРНАГА І САЦЫЯЛІНГВІСТЫЧНАГА КОМПЛЕКСАЎ У ПРАСТОРЫ ВКЛ

**АЛЕГ ДЗЯРНОВІЧ**

***Анатацыя:*** Шматкампанентная структура ВКЛ неаднаразова была тэмаю даследавання гісторыкаў. Вылучэнне з інтэгральнага цела ВКЛ такіх культурных і гістарычных рэгіёнаў, як "Літва", "Русь", "Жамойць", стала ўжо гістарыяграфічнай традыцыяй. Больш складанай уяўляецца справа з размежаваннем беларускага і ўкраінскага сацыякультурнага і сацыялінгвістычнага комплексаў у перыяд XIV–XVII стагоддзяў. Ці магчымая для ранняга перыяду ВКЛ (XIV–XV стагоддзяў) ідэнтыфікацыя ўкраінскіх і беларускіх моўных і культурных рысаў?

***Ключавыя словы:*** Вялікае Княства Літоўскае, Беларусь, Украіна, этнічнасць, мова.

# PROBLEMS OF IDENTIFICATION OF BELARUSIAN AND UKRAINIAN SOCIO-CULTURAL AND SOCIO-LINGUISTIC COMPLEXES IN THE TERRITORY OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA

***Abstract:*** The multicomponent structure of the Grand Duchy of Lithuania (GDL) has repeatedly been a subject of historical research. Separation of the cultural and historical regions of "Litva," "Ruś," "Žamojć" from the integral body of the GDL has already become a historiographical tradition. However, it is more difficult to delimit the Belarusian and Ukrainian sociocultural and sociolinguistic complexes of the sixteenth–seventeenth centuries.

***Keywords:*** Grand Duchy of Lithuania, Belarus, Ukraine, Ethnicity, Language.

pawet.net

Шматкампанентная структура ВКЛ неаднаразова была тэмаю даследавання гісторыкаў. Вылучэнне з інтэгральнага цела ВКЛ такіх культурных і гістарычных рэгіёнаў, як "Літва", "Русь", "Жамойць", стала ўжо гістарыяграфічнай традыцыяй (Спиридонов, 1996: 208; Насевіч і Спірыдонаў, 1996: 4–27; Дзярновіч, 2012: 30–53). Больш складанай уяўляецца справа з размежаваннем беларускага і ўкраінскага сацыякультурнага і сацыялінгвістычнага комплексаў у перыяд XIV–XVII стагоддзяў. Ці магчымая для ранняга перыяду ВКЛ (XIV–XV стагоддзяў) ідэнтыфікацыя ўкраінскіх і беларускіх моўных і культурных рысаў? Ці толькі Люблінская унія 1569 года стала фактарам размежавання этнаканфесійнага комплексу "Літоўская Русь"? Якая роля ў гэтых працэсах Берасцейскай царкоўнай уніі 1596 года? Праблемы аналізу сітуацыі ўскладняюцца яшчэ тым, што протабеларускія рысы не могуць быць аб'яднаныя толькі паняццем "Русь", але таксама і "Літва". У сваю чаргу, протаўкраінскі комплекс таксама мае шэраг культурна і часткова палітычна аўтаномных рэгіёнаў, якія знаходзіліся паміж сабой у рознай ступені ўзаемасувязей: Валынь, Кіеўшчына, Падолле, Галіччына.

Такім чынам, у тэме размежавання беларускага і ўкраінскага сацыякультурнага і сацыялінгвістычнага комплексаў у прасторы ВКЛ вылучаюцца некалькі вузлавых праблем.

1. Русь Вялікага Княства Літоўскага XIII–XV стагоддзяў – праблема вызначэння рэгіянальнай структуры.

Ці ўспрымалася Русь ВКЛ як цэльная тэрыторыя? Якія яна мела канатацыі (канфесійныя, этнічныя, тэрытарыяльна-рэгіянальныя)? У XIII–XIV стагоддзях тэрмін "Русь" набыў характар метаэтноніма (агульнай назвы некалькіх этнасаў). Разам з гэтым адбываецца і рэгіяналізацыя. Тэрыторыя Галіччыны (заходневалынскія землі), якая адышла да Польшчы, з сярэдзіны XIV стагоддзя атрымала назву Рускага ваяводства. У самім жа ВКЛ практычна ўся тэрыторыя рассялення ўсходніх славян мела назву "Русь", але апроч Верхняга Панямоння, на якое пашырылася назва "Літва" як часткі ядра ВКЛ. У XVI стагоддзі ў ВКЛ фіксуецца і больш вузкае значэнне тэрміна "Русь", якое тычылася ўсходняй часткі сучаснай тэрыторыі Беларусі. Гэтая "Русь" атрымлівае аднолькавы рэгіянальны статус з іншымі гістарычна-геаграфічнымі ўтварэннямі – Валынню, Падляшшам, Палессем (Насевіч, 2015: 96).

2. Праблема дэфініцыі актавай мовы.

Ці магчыма падзяліць пісьмовую традыцыю XIV–XVII стагоддзяў? Існуе некалькі варыянтаў моўнага размежавання канцылярскага пісьменства ВКЛ:

Хрысціян Станг (Stang, 1935, 1939): "валынскі перыяд" (паўночнаўкраінскі – паўднёвабеларускі) канца XIV – пачатку XV стагоддзя; "бела-

русізацыя” актавай мовы ў XV – пачатку XVI стагоддзя; беларуская канцылярская мова за часамі Жыгімонта Аўгуста (гаворкі Вільні і наваколля).

“Палескі” моўны комплекс мовы ВКЛ паводле Віктара Майсіенкі (2002: 92–115).

Сваю методыку графічнай дыферэнцыяцыі старабеларускіх і стараўкраінскіх тэкстаў прапанаваў беларускі даследчык Уладзімір Анічэнка (1969).

У палемічнай атмасферы гэтых дыскусій беларускі даследчык Ігар Клімаў (2009: 154) робіць выснову адносна праблемы размежавання ўкраінскіх і беларускіх помнікаў старажытнага пісьменства: *“...можа атрымацца так, што пытанне ў тым выглядзе, як яно пастаўлена, зусім не мае навукова карэктнага і аб’ектыўнага адказу. Езикъ руськый, зніклы ў XVIII стагоддзі, у XX–XXI стагоддзях стаў ахвярай беларускага і ўкраінскага нацыяналізму, што памкнуўся стварыць межы там, дзе іх, магчыма, не існавала і прымусіць навуку шукаць падзелы і складнікі, якіх, магчыма, ніколі не было*”.

3. Неадназначнасць канфесійнага фактару.

Нягледзячы на вельмі выразную канфесійную афарбоўку паняцця “рускаці” (“русінскасці”), трэба адзначыць, што ўплыў гэтага фактару не быў лінейным. Пасля Берасцейскай царкоўнай уніі 1569 года менавіта на тэрыторыі Беларусі пашырэнне ўніяцтва мела найбольшы поспех у XVII стагоддзі, у той час як у пазнейшым апірышчы грэка-каталіцтва, у Заходняй Украіне, царкоўная унія трывала замацавалася толькі пасля 1700–1702 года (далучэнне Львоўскай і Луцкай епархій).

4. Працоўная гіпотэза: фармаванне цэльнага рэгіёна “Русь” ранняга Новага часу адбылося найперш у межах ВКЛ і было вынікам канфесійнай і прававой практыкі цэнтральнай улады, а таксама пашырэння тэндэнцыі канфесіяналізацыі. Гэтая Русь Новага часу (XVI–XVII стагоддзяў) істотна адрознівалася ад аморфнай Русі Сярэднявечча сваімі акрэсленымі канфесійнымі і этнакультурнымі прыкметамі.

Можна меркаваць, што ў свядомасці большасці “рускага” (праваслаўнага) насельніцтва ВКЛ да XVI стагоддзя ні “польскасць”, ні “рускасць” не былі маркёрамі “этнічнасці”. Гэтыя канцэпты былі пазначэннем прыналежнасці да мясцовай канфесійнай агульнасці, гэта значыць, фактычна канфесіёнімамі, а не этнонімамі. Але пачатак Рэфармацыі, у тым ліку і на землях ВКЛ, актуалізаваў моўную (літоўскую і “рускую”) праблему ў практыцы кнігадрукавання і дэфініцыі моў. Маштабныя трансфармацыі другой паловы XVI стагоддзя (Люблінская 1569 г. і Берасцейская 1596 г. уніі) прывялі да змены сітуацыі і да набыцця “рускасці” этнічных характарыстык.

5. Імаверна, менавіта ў рамках украінскай “часткі” Русі ў XVII стагоддзі адбывалася рэцэпцыя новай, заходняй мадэлі этнагістарычнай памяці. Вядучую ролю ў гэтым працэсе заняла Кіева-Магілянская акадэмія. Паводле Міхаіла Дзмітрыева (Дмитриев, 2006: 26), у другой палове XVII стагоддзя праз выпускнікоў Кіева-Магілянскай акадэміі адбывалася прыўнясенне гэтых “універсальных” нормаў заходняй этнічнай мадэлі і ў Маскоўскую Русь, прыкладам чаго можа быць пашырэнне “Сінопсіса”.

6. З улікам складанасці праблемы беларуска-ўкраінскага размежавання пакуль што можна спыніцца на палітычным маркёры – Люблінскай уніі 1569 года і працэсах вакол яе, якія прывялі да дзяржаўна-адміністратыўнага адасаблення беларускага і ўкраінскага культурна-дэмаграфічных комплексаў.

### *Бібліяграфія*


1. Анічэнка, Уладзімір (1969). *Беларуска-ўкраінскія пісьмова-моўныя сувязі*. Мінск: Навука і тэхніка.

2. Дзярновіч, Алег (2012). “Пошукі Айчыны: “Літва” і “Русь” у сучаснай беларускай гістарыяграфіі”, *Палітычная сфера*, 18–19: 30–53.

3. Дмитриев, Михаил (2006). “Киево-Могилянская академия и этницизация исторической памяти восточных славян (Иннокентий Гизель и Феодосий Софонович)”, *Київська Академія*, 2–3: 14–31.

4. Клімаў, Ігар (2009). “Да праблемы размежавання ўкраінскіх і беларускіх помнікаў старажытнага пісьменства”, *Беларускі археаграфічны штогоднік*, 10: 133–158.

5. Мойсієнко, Віктор (2002). “До проблеми виділення «західноруського» наріччя, або Якою мовою писали на теренах українсько-білоруського пограниччя у XVI–XVII столітті?”, *Український гуманітарний огляд*, 7: 92–115.

6. Насевіч, Вячаслаў і Спірыдонаў, Міхаіл (1996). “«Русь» у складзе Вялікага княства Літоўскага ў XVI ст.”, *З глыбі вякоў. Наш край: Гісторыка-культуралагічны зборнік*, Выпуск 1. Мінск: Беларуская навука.

7. Насевіч, Вячаслаў (2015). *Беларусы: станаўленне этнасу і нацыянальная ідэя*. Смаленск: Інбелкульт.

8. Спиридонов, Михаил. (1996). “‘Литва’ и ‘Русь’ в Беларуси в XVI в.”, *Наш Радавод*, Кн. 7. Гродна: БДМГР.

9. Stang, Christian Schweigaard (1935). *Die westrussische Kanzleisprache des Grossfürstentums Litauen*. Oslo: Dybwad.

10. Stang, Christian Schweigaard (1939). *Die altrussische Urkundensprache der Stadt Polozk*. Oslo: Dybwad.